„...Развівайце ў сабе любоў да працы... Забірайце больш ведаў, вучыцеся“

(З новагодняга пажадання акад. І. П. Паулава моладзі Совецкага Союза)

ЗРОБЛЕНЫ ПЕРШЫЯ КРОКІ

Навукова-даследчая работа студэнтаў на фізмаце ў гэтым годзе—зусім вузкае месца. Кафедры не цікавіліся гэтым пытаннем і не арганізоўвалі студэнцтва. Праўда, кафедра матэматыкі давяла да студэнтаў тэмы самастойнай работы, але толькі ў канцы першага паўгоддзя за некалькі дзён да сесіі. Толькі спачатку другога паўгоддзя на трэцім курсе матэматыкаў арганізавалі спецсемінар.

Кафедра фізікі давяла да студэнтаў тэмы ў пачатку года, але яны былі неактуальныя (звязаны з курсам мінулага года) і таму студэнты ўзяўшыя тэмпы, над імі не працавалі. Па кафедры фізікі наогул становішча цяжкае, бо кафедра недастаткова забяспечана кваліфікаванымі работнікамі. Але і пры гэтых умовах можна было-б нешта-небудзь зрабіць.

Пастанова прафкома аб скліканні навукова-даследчай канферэнцыі некалькі ўскалыхнула грамадскасць факультэта. Зразумела, што сярод студэнтаў ёсць жадаючыя самастойна працаваць, і толькі трэба гэту работу арганізаваць. На другім і першым курсе матэматыкаў арганізован гад кіраўніцтвам прафесара Пятосіна навукова-даследчы гурток. Тэмы для работы ўзялі сем студэнтаў. На бліжэйшых занятках гуртка будзе заслухан даклад тав. **Атрашэнка** аб выдзяленні алгебраічнай часткі інтэграла рацыянальнай дробі.

11 сакавіка адбылося пасяджэнне кафедры фізікі, на якім было настаўлена пытанне аб арганізацыі навукова-даследчай работы. Выпрацаван план мерапрыемстваў. Студэнтам прананаван рад тэм. Спецыяльны фізпрактыкум, які ёсць на трэцім курсе, павінен стаць уводзінамі ў самастойную навукова-даследчую работу студэнтаў.

Апрача гэтага, на факультэце пачынае выходзіць бюлетэнь, у якім будуць змяшчацца работы студэнтаў. Гэты бюлетэнь ускалыхнуў ініцыятыву студэнтаў ў галіне самастойнай навукова-даследчай работы. Першы нумар бюлетэня выйдзе к адкрыццю канферэнцыі.

Але ўсё гэта — толькі пачатак работы, вярней, толькі план. Задача ў тым, каб гэты план рэалізаваць. Кафедры ні на адзін дзень не павінны аслабляць увагу да гэтай справы. Профарганізацыя факультэта павінна звярнуць сур'ёзную ўвагу на выдатнікаў і лепшых ударнікаў вучобы, сачыць за іх работай і ростам. Трэба напомніць, што выдатнікам можа лічыцца толькі той, хто прымае ўдзел у навукова-даследчых гуртках.

РОДАЎ.

НА ЗДЫМКУ: Лепшы комсамольскі групорг хімфака тав. ВЕРАСОЎСКІ на курорце ў Крыму.

Работа навукова даследчых гурткоў

На біялагічным факультэце навукова-даследчыя гурткі арганізаваны пры усіх кафедрах. У гэтых гуртках працуе 58 студэнтаў другога і трэцяга курсаў. Сюды трэба аднесці і студэнтаў-дыпломнікаў.

Гурток пры кафедры фізіялогіі і анатоміі раслін працуе пад непасрэдным кіраўніцтвам прафесара Годнева. У гэтым гуртку працуе 11 студэнтаў. На вегетацыйны перыяд (вясна—лета) гурток намеціў рад даследчых работ. Намечан цэлы рад тэм. Так, студэнтка Гурынович будзе працаваць над вывучэннем уплыву солей жалеза на накапленне каранёў і морквы. Студэнт Хацінскі будзе працаваць над тэмай: фотаперыядызм у раслін; студэнт Галудзь над азнаямленнем з работай каталазы; студэнтка Файн—над методыкай пастаноукі пясчаных, водных і глебавых культур.

Гурток пры кафедры зоалогіі пазванковых, якім кіруе дацэнт Зубковіч, працуе слаба. За гэты час на гуртку было зроблена толькі два даклады. Але на летні перыяд гурток вызначыў некалькі асноўных тэм, над якімі будуць працаваць удзельнікі гэтага гуртка. Так, будзе праводзіць апрацоўку матэрыяла па тэме «Рыбы і амфібіі БССР». Вызначана тэма «Паляўніча-прамысловая фауна раёна» і «тэхніка эмбрыялагічных даследванняў» і вывядзенне на аснове матэрыяла біягенетычнага закона.

Гэтымі днямі распачаў работу гурток пры кафедры зоалогіі безпазванковых. Гэтым гуртком кіруе дацэнт Гусева. Гурток займецца расцэнкаўкай гідрафлоры азер басейна Прыпяці.

Значна перашкаджае ў разгортванні навукова-даследчай работы на факультэце недахоп абсталявання, памяшканняў і перагружанасць студэнтаў. Трэба таксама сказаць, што і дэканат да гэтага часу не звяртаў належнай увагі на разгортванне навукова-даследчай работы студэнтаў.

ХАЦІНСКІ.

Наша работа

Адным з першых навукова-даследчых гурткоў, які пачаў сваю работу ў гэтым годзе, з'яўляецца гурток другога курса пры кафедры аналітычнай хіміі. Прафесар Ермоленко і аспірант Будкевіч выпрацавалі тэматыку работ, з улікам падрыхтаванасці студэнтаў.

Тэматыка гуртка складаецца з раду эксперыментальных работ. Гурткоўцы перш чым прыступіць да эксперыментальнай работы, дэтальна азнаёмілся з максімумам літаратуры, якая мае дачыненне да тэм.

За першае паўгоддзе гуртком распрацавана пяць тэм, з іх адна работа «Бессеравадародны ход аналіза IV групы».

Трэба адзначыць вялікую зацікаўленасць работай гуртка з боку прафесара Ермоленко, які сваім непасрэдным кіраўніцтвам, парадамі, праверкай работ, таварыскімі ўказаннямі многа дапамагае студэнтам.

АСТРАХАНЬ.

Тав. Пятровіч — выдатнік 3-га курса біяфака — член навукова-даследчага гуртка.

Просім дапамогі

У снежні мінулага года былі арганізаваны дзве валейбольныя каманды—мужчынская і жаночая. Загадчык кафедры абаронаай справы тав. Спегальскі запрасіў трэнера, які праводзіў заняткі з камандамі. Трэба сказаць, што ён адносіўся да сваёй работы добрасумленна.

Але на сённешні дзень валейбольныя каманды распаліся, бо трэнеру не заплацілі за трохмесячную работу.

ШМУШКОВІЧ.

Хімфакаўцы змагаюцца за першае месца

У пастаноўцы хімічнай асветы асноўную ролю адыгрывае навукова-даследчая работа. Асаоліваэ значэнне навукова-даследчая работа мае таму, што кожны новы метад, кожная новая рэакцыя расшырае спосабы ўжывання вывучаючай сыравіны. Расшырае сыравінную базу нашай прамысловасці.

Навукова-даследчая работа, якая крыху лепш пастаўлена на хімфаку, чым на іншых факультэтах, не можа, аднак, задаволіць нас у сувязі з узрослымі запатрабаваннямі нашай сацыялістычнай прамысловасці.

Прайшло ўжо больш 6-ці месяцаў навучальнага года, і мы можам падвесці некаторыя вынікі па факультэту. Навуковыя гурткі былі арганізаваны на другім і трэцім курсах. На трэцім курсе навукова-даследчымі гуркамі ахоплена ляць студэнтаў і на другім сем. На першым курсе мы мелі гурткі для паглыблення вывучанага матэрыялу па хіміі на аснове прапрацоўкі дадатковай літаратуры.

Зараз па ініцыятыве прафесара Змачынскага арганізован выпуск журнала «За совецкую хімію»—орган навукова-даследчых гурткоў. Журнал яшчэ мае недахопы як у тэхнічным афармленні, так і ў самым падборы матэрыялаў, але ён мае ўсе магчымасці зрабіцца цікавым журналам.

Сапраўдную навукова-даследчую работу арганізавала і правяла кафедра аналітычнай хіміі са студэнтамі другога курса. Ініцыятараваўцы выключную ініцыятыву праявілі і праф. Ермоленко і асістэнт Будкевіч, якія забяспечылі добрую пастаноўку работы.

Прафарганізацыя праводзіць недастатковую работу з выдатнікамі і ўдарнікамі. Калі раней мы змагаліся за высокаякаснае ўсваенне праграмнага матэрыялу, то цяпер неабходна гэту барацьбу дапоўніць барацьбой за вядзенне навукова-даследчай работы ў першую чаргу выдатнікамі і ўдарнікамі вучобы.

Мы ў сваіх радах маем ініцыятыўных студэнтаў, поўных сіл і энергіі. Трэба іх арганізаваць, даць напрамак іх рабоце. За гэта павінны ўзяцца ўсе нашы арганізацыі. Хімфакаўцы будуць змагацца за першае месца ў пастаноўцы навукова-даследчай работы.

КОНЮШКО.

Напярэдадні абмену партдакументаў

„Новы партыйны білет павінен атрымаць толькі той, хто сапраўды ўмее трымаць высока і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі.“

(„ПРАВДА“)

РЫХТУЕМСЯ ДА АБМЕНУ ПАРТДАКУМЕНТАЎ

Абмен партдакументаў з'яўляецца не фармальна тэхнічнай справай, а сур'ёзным партыйна-арганізацыйным мерапрыемствам.

Пытанне падрыхтоўкі да абмену партдакументаў абмяркоўвалася на сходзе партгрупы, дзе было дэтальна растлумачана значэнне гэтай справы.

На сходах партгрупы распрацован статут партыі. Заслуханы індывідуальныя справаздачы камуністаў: Кавалёва, Собалева, Цукермана, Зельдзіна і Мельнка. У выніку Собалеў і Кавалёў, якія раней слаба рыхтаваліся да партзаняткаў, акадэмічна не паспявалі, на сённешні дзень пачалі добра рыхтавацца да партзаняткаў, прымаць актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці факультэта, паспяваць у акадэмічнай вучобе.

За гэты час значна палепшылася дысцыпліна. Мы не маем выпадкаў спазнення на партсходы, на заняткі партшкол. Амаль усе члены і кандыдаты партыі вядуць канспекты. Асабліва сур'ёзна рыхтуюцца да партзаняткаў тт. Фрыдман, Назнякоў, Дучыцкая і Рамашка. Але ёсць і такія, якія адносяцца да партвучобы з халадком. Тав. Зельдзін некалькі раз прапусціў заняткі. Адзіны камуніст у сваёй групе на 1 курсе, Зельдзін не з'яўляецца прыкладным і перадавым.

Ёсць яшчэ выпадкі нядобрасумленнага выканання партыйных даручэнняў. Тав. Шпакоўскі — кіраўнік палітгуртка — не заўсёды рыхтуецца да заняткаў.

Члены партыі слаба ўдзельнічаюць у насцендруку; лічаць гэта другараднай справай.

У гэту шасцідзенку мы намецілі на сходзе групы прапрацаваць праграму партыі, а ў бліжэйшы час заслухаем індывідуальныя справаздачы і астатніх камуністаў партгрупы.

Парторг фізмата ЦОІР.

Яшчэ ёсць недахопы

У выніку праверкі партдакументаў у партгрупе гістфака выяўлены і выключаны з партыі тыя хто не варт быць членам партыі, хто ў партыю папаў выпадкова, хто выкарыстоўваў свой партбілет у карыслівых мэтах.

Камісія на праверцы сур'ёзна ўказала некаторым членам і кандыдатам партыі на іх слабую ўзброенасць маркісцка-ленінскай тэорыяй, на іх пасіўнасць, на тое, што яны не з'яўляюцца перадавымі сярод масы студэнтаў.

Партгрупа адсюль вынесла належны ўрок. У часе падрыхтоўкі да абмену партдакументаў на гэтых пытаннях і была завострана ўвага. Заслуханы індывідуальныя справаздачы таварышоў Ладуцька, Бірылка, Бабчонак. Выявілася, што гэтыя таварышы палітычна слаба падрыхтаваны, дрэнна выконваюць партдаручэнні (Бірылка), не рыхтуюцца і не наведваюць партзаняткаў (Ладуцька). Зараз мы можам адзначыць, што таварыш Ладуцька ўлічыў даныя яму на сходзе ўказанні. Ён цяпер акуратна рыхтуецца да партзаняткаў і добра выконвае даручаную яму работу. Таксама і Бірылка пачынае плакаць, што яе недаацэньваюць, а ўзялася за работу.

Але ёсць і такія камуністы, якія не зразумелі ўсёй важнасці абмену партыйных дакументаў.

Тав. Лапуноў слаба працуе над сабой, адарваўся ад актыўнай работы на факультэце, адстае ў акадэмічнай вучобе.

Тав. Місуна таксама слаба працуе над сабой, палітычна недастаткова падрыхтаваны. Перад гэтымі таварышамі на апошнім партсходзе, які адбыўся 15 сакавіка, сур'ёзна паставлена задача—узяцца за работу над сабой, не задавальняцца старым запасам ведаў. Партсход даручыў парторгу Савасцянчыку штодзенна правяраць тт. Лапунова і Місуна, як яны працуюць над творамі класікаў марксізма, што чытаюць з мастацкай літаратуры, як рыхтуюцца да акадэмічных заняткаў, і наладзіць ім дапамогу.

На чарговым сходзе партгрупы будзе прапрацавана праграма партыі.

МАЛЮКЕВІЧ

Заняткі ў процівагазах



Студэнты фізмата другога курса на лекцыі фізікі прафесара Сняткова ў процівагазах.